**Якаўлева, А.** Служба пад прыцэлам / А. Якаўлева // Голас Сенненшчыны. — 2014. — 11 лют. — С. 3.

**СЛУЖБА ПАД ПРЫЦЭЛАМ**



**Сяргея Шугальскага, хлопца з в. Цыпкі, адразу з ваенкамата накіравалі ў вучэбку для лётных часцей у Ташкент. Маладога салдата, які меў спецыяльнасць вадзіцеля паліўна-запраўчных сродкаў, пасля шасці месяцаў абучэння асновам запраукі самалётаў, адправілі ў Афганістан, на авіябазу Баграм. Гэта быў 1986 год.**

Пра падзеі ў Афганістане Сяргей Фёдаравіч не любіць успамінаць. Нават калі і зойдзе размова пра «чужую» вайну, адмоўчваецца. «Для мяне гэта была звычайная служба, – гаворыць мой субяседнік. – Нічога гераічнага ў тым, што я запраўляў самалёты, быў вадзіцелем аўтобуса – няма». Сяргей Шугальскі хавае сваё ўнутранае хваляванне, аднак за гэтымі словамі адчуваецца, наколькі складана прыходзілася як у фізічным, так і ў маральным плане.

Два гады – пад прыцэлам. У любую хвіліну можна было трапіць пад кулю.

Недалёка ад авіябазы быў размешчаны 345 парашутна-дэсантны полк. Калі салдаты адпраўляліся на баявыя заданні, душманы адразу пачыналі абстрэл тэрыторыі. І тым, хто заставаўся ў часці, даводзілася трымаць хоць і не вялікія, а усё ж баі.

Сваю першую сустрэчу з ворагам Сяргей Шугальскі памятае і сёння: «Стралялі усюды. А мы, маладое папаўненне, проста стаялі і глядзелі, што адбываецца». У галаве нават думкі не было, каб схавацца ва ўкрыцці, адстрэльвацца. Пачуццё не страху, а трывогі з-за таго, што не ведалі як паводзіць сябе, валодала імі. Гэта ужо потым, калі ўсё супакоілася, салдатам растлумачылі, што рабіць у такіх сітуацыях.

Узброеныя сутыкненні з ворагамі адбываліся практычна кожны дзень. Аднойчы, падарваўшы самалёт на аэрадроме, духі стралялі па яго тэрыторыі з 9.00 гадзін раніцы да 17.00 вечара. У лётчыкаў не было зброі, каб весці бой. Сяргею Шугальскаму і аднаму з салдат было загадана прывезці на аўтобусе бронежылеты і аўтаматы са склада, які знаходзіўся на другім канцы аэрадрома. Пад абстрэлам салдаты, ахвяруючы сабой, зброю даставілі.

Смерці былы афганец менш за ўсё баяўся. Заўсёды ў хвіліны небяспекі з галавы не выходзілі бацькі. Страшна было за іх: як перажывуць родныя людзі, калі дамоў прыбудзе «груз 200».

«А вайны без страт, зразумела, не бывае, – гаворыць Сяргей Фёдаравіч. – Байцы гінулі часта. Аднойчы нават давялося пачуць, як спрачаліся між сабой афіцэры, каму з іх суправаджаць цынкавыя грабы на радзіму».

Пасля вяртання дамоў, мужчына працаваў вадзіцелем у розных арганізацыях. Апошнім месцам яго працы быў ПАВП № 14 Сенненскага РАНС, адкуль і пайшоў на пенсію. Сёння разам з сям'ёй жыве у Багушэўску.

На пытанне, ці хацеў бы вярнуцца яшчэ раз у Афганскую краіну, толькі ўжо ў якасці турыста, Сяргей Фёдаравіч пасля маўчання адмоўна ківае галавой: «Варушыць былое не хацелася б».

***Ала Якаўлева***

**НА ЗДЫМКУ:** Сяргей Шугальскі